# Па сьлядах “Скамароха”

Ёсьць у гісторыі нашай малой бацькаўшчыны асобы, месцы і падзеі, якія не перастаюць прываблівалць аматараў мінуўшчыны. Да іх належыць Герман Шыманюк “Скамарох” і ягоная партызаншчына ў Белавескай пушчы. Хадзілі калісьці па сьлядах беларускіх партызанаў Юрка Туронак, Уладзімер Юзьвюк і Васіль Петручук, пасьля — мы з Генікам Вапам і Юркам Калінам. Не агледзеліся, і ўжо падасьпела трэцяе пакаленьне, гатовае рушыць партызанскім шляхам.

Кожны шукае па–свойму. Хлопцаў, якія наладзілі наш апошні паход у пушчу, зацікавіла тое, што матэрыяльнае засталося ад таго часу. Паслухаўшы маіх расказаў пра партызанаў, Ігар Лукашук з Гайнаўкі арганізаваў са сваімі сябрамі экспэдыцыю, “узброеную” дэтэктарам мэталу. Найбольш мараў удзельнікаў паходу выклікаў кулямёт, пра які я недзе вычытаў, што хлопцы “Скамароха” прывезьлі яго зь Літвы і якога не знайшла паліцыя падчас ліквідацыі партызанскага атраду.

У пушчу едзем на “Рафіку” гайнаўскага Беларускага музэю. Спадар Майсеня, вядома, ня так ужо спадзяваўся на ўзбагачэньне калекцыі музэю, колькі ўцешыўся, што цікаўнасьць да мінуўшчыны сярод маладых не прападае. Зьдзівіўся толькі, што ня ўсе хлопцы з адной школы. Спадзяваўся, відаць, што ўсе яны будуць з гайнаўскага Беларускага ліцэю, а тут аказалася, што склад экспэдыцыі вельмі пярэсты. Хто з Гайнаўкі, хто зь Бельску, а хто зь Беластоку, хто зь ліцэю, а хто з тэхнікуму. Растуць тыя беларусы, дзе іх і ня сеюць.

Шофэр Янка Ляшчук (з суседніх з Лукой маёй маці Боўтрыкаў) вязе нас сьпярша ў Доўгі Брод, інакш Мацкевічы, да Яўгена Вапы, аднаго зь вялікіх аматараў “скамарохаўшчыны”. Старшыню Беларускага саюзу засьпелі мы, як належыць у сярэдзіне верасьня, у полі. Вапы згоднай сям’ёй капалі бульбу. Геніка ад бульбы адарваць было немагчыма, але знайшоў ён нам надзейнага праваднікa. Дзед Уладзімер Германюк, 1907 году нараджэньня, пасьпеў у сваім доўгім жыцьці двойчы быць партызанскім сувязным: у “Скамароха” пасьля Першай сусьветнай вайны і ў савецкіх партызанаў — падчас Другой.

Дзед Уладзімер ахвотна сядае з намі ў “Рафік”, але асьцерагаецца, што знайсьці колішні логаў “Скамароха” практычна немагчыма, бо за столькі гадоў усё перамянілася. Лес расьце там зусім новы, пасаджаны пасьля другой сусьветнай вайны. Едзем у лес за Тафілаўцы, пад граніцу. Калі выгружаемся з “Рафіка” і Кшысь Ангельчык выцягвае свой дэтэктар, дзед Уладзімер сьмяецца, што не мэталу нам шукаць, а толькі шкла. З расказаў ведае (яго, хлапчука, у самую сваю схованьпартызаны не дапускалі), што зямля вакол будана партызанаў усьцелена была пустымі бутэлькамі з–пад гарэлкі, якую хлопцы “Скамароха” ўзялі падчас нападу на рэстаран у Кляшчэлях і ўсю акуратна выпілі.

Заглыбляемся ў лес і шукаем г. зв. “шьі”, значыць, языка лесу між лугоў (ці то наадварот).

Дзед Уладзімер бойка брыдзе лесам–лугам, а мы зь ім. Дэтэктар маўчыць, не піпікае. Бутэлькаў таксама нешта не відаць. Хлопцы рассыпаліся па лесе, а мы са Славікам Іванюком слухаем расказы дзеда Уладзімера пра бежанства, партызаншчыну адну і другую. “Я–то заўжды быў за саветамі”, — заяўляе дзед, на што я кідаю з усьмешкай, што няма ўжо такіх саветаў, разьвязалі іх Савецкі Саюз тут у пушчы па–суседзку. Дзед Уладзімер паглядае на мяне таксама з усьмешкай і ўсе трое сьмяёмся, аб’яднаныя пачуцьцём абсурду і нашай у ім супольнасьці.

Хлопцы вяртаюцца з пустымі рукамі, калі не лічыць бутэлькі з–пад ліманаду, старадаўняй ужо, але безумоўна пасьляваеннай прадукцыі, і сучасна стандартнай бутэлькі з–пад віна.

Едучы назад, вырашаем усё ж такі не здавацца. Дзед Уладзімер абяцае дакладна выпытаць тых, хто яшчэ можа памятаць, Славік Іванюк — знайсьці тагачасную карту, а хлопцы плянуюць прыехаць яшчэ раз летам пад палатку пашукаць даўжэй.

У Гайнаўцы яшчэ хутка перабягаем музэй (спадар Майсеня, вядома, нас бяз гэтага не адпусьціў). Будуюць — і безумоўна пабудуюць, а памалу і маладыя далучацца.

Разьвітаўшыся з музэем і яго гаспадарамі, разыходзімся–разьяжджаемся дахаты.

Падчас спозьненага абеду расказваю маці аб паездцы. Маці, выслухаўшы пра партызанаў, мэталалом і шклатару, пытаецца нарэшце па–сялянску, канкрэтна: “А як там бульба ў Вапаў?” Тут глянуў я на яе крыху недаразумяваючы, а пасьля і неяк вінавата. Фактычна, нават не спытаўся. Ды ня толькі я, але проста ніхто не пацікавіўся. Што ж, нарасло пакаленьне “бульбашоў”, якое бульбу купляе ў краме, у якой яна заўжды ёсьць, нягледзячы на ўраджай. Такая вось нечаканая выснова атрымалася.

*Друкуецца паводле публікацыі ў:* Ніва. 1995. 22 кастрычніка. № 43. С. 4.